ПАДРЫХТОЎКА ДА ПРЫЁМУ Ў РАДЫ КОМСАМОЛА

Два дні (4 і 5 студзеня) працягвалася нарада сакратароў гарадскіх і павятовых камітэтаў комсамола, скліканая Беластоцкім абкомам ЛКСМБ.

На нарадзе былі абмеркаваны пытанні аб пачатку прыёму працоўнай моладзі заходніх абласцей БССР у рады ленінска-сталінскага комсамола і стварэнні пры школах піонерскіх арганізацый. Была заслухана інфармацыя сакратара абкома комсамола тав. Пічурэнкі аб рашэннях X пленума ЦК ВЛКСМ.

Сакратары гарадскіх і павятовых комсамольскіх камітэтаў расказвалі, як рыхтуюцца на мясцах да прыёму ў рады ВЛКСМ.

У горадзе Гродна на прадпрыемствах працуюць 8 гурткоў па вывучэнню статута і праграмы ленінскага комсамола. На веласіпедным заводзе гурток наведвае каля ста маладых рабочых і работніц. 7 маладых рабочых піварнага завода ўжо азнаёміліся са статутам і праграмай комсамола. Уся работа з моладдзю праводзіцца ў клубах і чырвоных кутках, якія маюцца на кожным прадпрыемстве. У горадзе 19 чырвоных куткоў і некалькі клубаў.

Гродненскім гаркомам комсамола праведзена больш 120 дакладаў і лекцый для моладзі горада. 25 снежня быў праведзен першы сход жаночай моладзі горада, на якім прысутнічала 280 чалавек. Нядаўна закончылі работу 10-дзённыя прапагандысцкія курсы, на якіх навучалася 30 чалавек. 13 з іх зараз з'яўляюцца загадчыкамі чырвоных куткоў і 2—культработнікамі на прадпрыемствах.

Вялікую ўвагу звярачвае горком комсамола г. Гродна на арганізацыю фізкультурнай работы. Праведзен гарадскі сход фізкультурнікаў, на якім былі заслуханы даклады аб фізкультурным руху ў СССР і аб новых нормах на значок ГПА (Гатоў да працы і абароны). Арганізавана гарадская дзіцячая спартыўная школа. Працуе баксёрская секцыя. Адчынена 4 каткі.

Больш 240 чалавек сялянскай моладзі Гродненскага павета вывучаюць праграму і статут комсамола.

У Сакольскім павеце арганізавана 23 гурткі па вывучэнню праграмы і статута ВЛКСМ і 26 гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі. Для моладзі г. Сакольскі прачытана 11 лекцый. Пры гарадскім Доме соцкультуры створан актыў з 160 чалавек. Працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці. Арганізаван джаз - аркестр, харавы гурток, у якім удзельнічае 90 чалавек.

Рыхтуюцца да прыёму ў рады ВЛКСМ і Граеўскі камітэт комсамола. У 35 гуртках па вывучэнню статута і праграмы комсамола займаецца 1.200 чалавек. Па валасцях павета праведзена 30 дакладаў і гутарак аб Сталінскай Канстытуцыі і аб комсамоле. У горадзе Граева праведзена 6 вечароў моладзі. Вялікая палітвыхаваўчая работа праводзіцца ў школах павета. У гарадской гімназіі ўкомам ЛКСМБ пры дапамозе вучнёўскага актыва выкрыта контррэвалюцыйная група, якую ўзначальваў сын жандарма.

Комсамольская арганізацыя вобласці прыступае да адказнейшага ўчастка работы—прыёму ў рады ВЛКСМ. У комсамол павінна быць прынята передавая, адданая справе партыі Леніна—Сталіна працоўная моладзь. Патрабуецца сур'ёзны, індывідуальны падыход до кожнага жадаючага паступіць у комсамол.

М. Шах.



На здымку: тав. Кракус А. — лепшая клейшчыца на дзяржаўным фанерным заводзе ў г. Беластоку.
(Фота Сапір).

В ДОМЕ НАРОДНОГО ТВОРЧЕСТВА

Дом народного творчества включился в реализацию решения ЦК КП(б)Б о развитии искусства.

4-го января при Доме народного творчества было созвано собрание молодых художников — самоучек Белостока, на котором был разработан тематический план по подготовке к выставке 1940 года „Ленин и Сталин — организаторы белорусской государственности". Молодые художники с большим энтузиазмом заявили о своей готовности работать. Они никогда, до сих пор, не имели возможности учиться, развивать свои таланты. Они работали до сих пор без плана, без помощи.

Молодой 15-летний художник Засницкий принес на собрание вылепленную из глины скульптуру Сталина и ряд рисунков на тему освобождения Западной Белоруссии.

С 10-го января организуется при белостокском Доме народного творчества ИЗО студия для молодых художников по подготовке к участию в выставке 1940 года. Лучшие, способнейшие художники поедут на 2-х месячный семинар, который откроется при республиканском Доме народного творчества в Минске.

10-го января намечается открытие ИЗО кружков вышивки при ряде предприятий, в том числе при клубе железнодорожников, на кожевенном комбинате, на 1-ом текстильном комбинате, на вечерних курсах и т. д.

Л. Рудин.

ЯК АРГАНІЗАВАНА РАБОТА Ў ГОРАНА

Калі верыць указальніку горвыканкома, то аддзел народнай асветы знаходзіцца ў 12 і 13 пакоях. Але наведвальнікам прыходзіцца патраціць шмат часу на пошукі аддзела, які далёка схаваўся ў пакоях пад другім нумарам.

Аддзел народнай асветы размясціўся ў 4 пакоях і ні на адных дзвярах не павешана шыльда.

З цяжкасцямі знаходзім кабінет загадчыка горАНА тав. Фешчэнка. Яго самога няма. Наведвальнікі неўпэўнена чакаюць, яны самі не ведаюць, ці будзе ён. Нідзе не ўказан час прыёму.

На месцы Фешчэнка мы засталі настаўніцу Міцкевіч. Па яе расказах відаць, што яна тут не ўпершыню. Тав. Міцкевіч прыехала з Мінска 20 снежня 1939 г. і да гэтага часу не атрымала месца работы.

Запыхаўшыся прышоў тав. Фешчэнка і за ім 6—7 чалавек. Ён пачынае прыём. Наведвальнікам няма дзе сесці. У пакоі шум і цесната. Супрацоўніца аддзела звоніць па тэлефону ва ўсе школы: яна склікае настаўнікаў на сход. У такой абстаноўцы цяжка пачуць, што гаворыць загадчык. Але да нас усё ж такі даляцелі некаторыя словы яго:

—Прыдзіце праз пару дзянькоў. Не, хоць мала часу, прыдзіце ну... праз 5—6 дзён.

— У вас няма загадчыка? Заўдзіце, калі будзе менш людзей, пагаворым.

Калі Фешчэнкі няма, спрабавалі прымаць наведвальнікаў дашкольны інспектар, сакратар, і часам нават бухгалтар.

Дрэнна пастаўлена справа з учотам і адказамі на заявы. Тут забыліся аб тым, што за кожнай заявай стаіць жывы чалавек. Заявы ад дашкольных работнікаў „хаваюцца", напрыклад, у супрацоўніцы тав. Крыгель. Яна нават да гэтага часу не ведала, што патрэбна чытаць заявы, рэгістраваць іх у асобны сшытак, захоўваць і беражліва адносіцца да іх.

Другая частка заяў знаходзіцца ў намесніка загадчыка тав. Бойка. Праўда, у яе ёсць рэгістрацыйны сшытак, але заявы таксама доўга залежваюцца.

Былі выпадкі, калі настаўнікі без ведама горАНА устраіваліся ў школах на работу. Супрацоўнікі горАНА, разглядаючы заявы, не ведаюць, ці атрымаў даны чалавек работу. У папцы тав. Крыгель мы знайшлі заяву выхавацельніцы Штейнберг. Яна просіць работу ў вобласці. Трэба было накіраваць гэту заяву ў абл-АНА, а яна ляжыць тут з 19 снежня.

Зараз горАНА трэба правесці вялікую работу па рэарганізацыі школ. Але ў гэтых адносінах тут яшчэ мала чаго зроблена. Многія дырэктары не ўяўляюць сабе, у чым канкрэтна заключаецца перабудова работы ў школах. Хоць на гэту тэму быў даклад, але гэтага недастаткова. Некаторыя дырэктары школ не маюць новых праграм. Для старэйшых класаў не хапае падручнікаў па гісторыі СССР і другіх прадметах. ГорАНА яшчэ не прыступіў да ўкамплектавання школ настаўнікамі.

Былі выпадкі, калі горАНА не сур'ёзна падыходзіў да падбору настаўнікаў, што дало магчымасць пралезці на гэты важнейшы ўчастак работы варожым элементам.

Загадчык горАНА не правярае работу сваіх супрацоўнікаў, рэдка праводзіць з імі нарады. І зусім правільна, калі тав. Бойка гаворыць, што можна было зрабіць значна больш, калі быў-бы правільна выкарыстан увесь апарат горАНА.

В. Шахоўскі.

Физкультурная работа

Гродненский городской комитет физкультуры и спорта проводит деятельную работу среди трудящейся молодежи по организации физкультурной работы на предприятиях и в школах города.

Для этой цели открыты курсы по переподготовке инструкторов физкультуры. На этих курсах занимается 40 человек. После окончания их эти люди будут посланы на работу на предприятия города.

Для учащейся молодежи организована спортивная школа, которая имеет гимнастическую, акробатическую и ряд других секций.

При городском комитете физкультуры работает боксерская секция, которую посещает 17 человек. Сейчас боксеры энергично готовятся к спортивной встрече с боксерами Белостока.

680 безработных получили работу

Со времени освобождения города Августова и уезда от ига помещиков и капиталистов основное внимание было обращено на ликвидацию большого числа безработных.

Уездным отделом труда при Августовском исполкоме было зарегистрировано 978 человек безработных. Среди них были бухгалтера, металлисты, счетоводы, приказчики и люди других профессий.

Сейчас уже 680 человек получили работу. Одновременно уездным отделом социального обеспечения за время с 1-го октября по 31-е декабря оказана большая материальная помощь безработным. Для закупки дров было израсходовано 2 431 руб., 8.047 руб. израсходовано на питание, 10.071 руб. на единовременное пособие, 10.822 руб. на выплату пенсий женщинам, мужья которых не возвратились с последней войны.

Шулейко.

26 МЕСЯЦАЎ НА ДРЭЙФУЮЧЫМ КАРАБЛІ

23 кастрычніка 1937 года ў ільдах Паўночнага Ледавітага акіяна на 75 градусе 21 мінуце паўночнай шыраты і 132 градусе 15 мінуце ўсходняй даўгаты сталі на зімоўку 3 совецкіх параходы — „Седоў", „Садко" і „Малыгін".

Наступіла глыбокая паўночная ноч. Каманды параходаў стойка неслі цяжкую вахту, герэічна змагаліся са стыхіяй, прікладаючы ўсе намаганні к таму, каб захаваць караблі і людзей. Усяго на дрэйфуючых караблях знаходзілася 217 чалавек. Для вядзення навуковых работ і захавання суднаў у час дрэйфа такой колькасці людзей не патрабавалася. Урад рашыў пакінуць на ледаколах строга абмяжованы лік членаў экіпажа. К дрэйфуючым караблям былі накіраваны 3 цяжкіх самалёты, які ўдзельнічалі ў вызвалены папанінскай экспедыцыі на крыгу ля Паўночнага Полюса. Летчыкі Алексееў, Галавін і Орлоў зрабілі 3 смелых рэйсы, — з бухты Тіксі — к каравану дрэйфуючых суднаў і бліскуча выканалі сталінскае заданне. Яны даставілі з дрэйфуючых ледаколаў на Вялікую Зямлю 184 чалавекі.

...Ледакольныя параходы прадаўжалі дрэйфаваць на поўнач.

Палярнай вясной 1938 г., па прапанове таварыша Сталіна, на дапамогу дрэйфуючым караблям быў накіраван ледакол „Ермак". Пабіўшы рэкорд вольнага плавання ў ільдах, 28 жніўня 1938 г на шыраце 83 градусы 06 мінут ледакол падышоў к дрэйфуючым суднам. Пасля ўпорнай, працяглай барацьбы з ільдамі „Ермаку" ўдалося вырваць з ледзянога палону „Садко" і „Малыгіна". Спробы вызваліць „Седов" закончыліся безрэзультатна: у час моцнага сціскання льдоў у яго было пашкоджана рулявое ўпраўленне. „Ермак" узяў „Седова" на буксір. Буксіроўка ішла вылючна цяжка. У „Ермака" зламаліся грабяныя валы. Тады было прынята рашэнне — пакінуць „Седова" ў дрэйфе, як рухомую навукова даследчую станцыю. З саставa экіпажа „Ермака" на борт „Седова" перайшлі лепшыя, праверaныя маракі: старшы механік - ордэнаносец Дмітрый Грыгор'евіч Трафімаў, радыст Нікалай Міхайлавіч Бекасаў, качагар-стаханавец Іван Іванавіч Гетман, повар-марак Павел Уласавіч Мегер, машыніст Іосіф Маркавіч Недзвецкі і матрос Ефрэм Іванавіч Гаманкоў. З каманды „Седова" на другую зімоўку засталося 9 чалавек: капітан „Седова" Канстанцін Сергеевіч Бадзігін, памочнік капітана, інжынер Андрэй Георгіевіч Ефрэмаў, радыст Александр Александравіч Палянскі, урач Александр Петровіч Сабалеўскі, боцман Дмітрый Пракоф'евіч Буторын, машыніст-стахановец Нікалай Сергеевіч Шарапаў, другі механік Сергей Дмітрыевіч Токараў, трэці механік Всевалад Сцяпанавіч Алфераў і малады вучоны гідрограф Віктар Харламп'евіч Буйніцкі.

На борт „Седова" была перагружана вялікая колькасць прадуктаў, навуковае абсталяванне і рознае палярнае абмундзіраванне. Зімоўшчыкі атрымалі таксама 2 радыёстанцыі і разборны драўляны дом. Гераічнае судно з жменькай смельчакоў засталося ў ільдах Паўночнага Ледавітага акіяна...

Палярнай восенню таго-ж 1938 г. была прадпрынята яшчэ адна спроба вывесці „Седова" з ільдоў. На поўнач ад Новасібірскіх астравоў, дзе ў той час знаходзіўся дрэйфуючы карабль, накіраваўся флагман арктычнага флота лінейны ледакол „І. Сталін". Следам за ім ішоў ледарэз „Літке", які павінен быў буксіраваць „Седова".

Да „Седова" засталося ўсяго некалькі дзесяткаў міль. Але нават для такога магутнага арктычнага судна, як ледакол „І. Сталін", гэтыя апошнія мілі аказаліся непраходзімымі і ён вымушан быў змяніць курс.

Каманда „Седова" прадаўжала спакойна несці вахту ў халодных прасторах Арктыкі.

За год дрэйфа „Седоў" прайшоў 1500 міль з сярэдняй хуткасцю 4 мілі ў суткі. 23 кастрычніка, у першую гадавіну дрэйфа, седоўцы атрымалі прывітальную тэлеграму ад таварышоў Сталіна і Молатава:

„Ледакол „Седоў" Капітану Бадзігіну, парторгу Трафімаву.

У гадавіну дрэйфа шлем вам і ўсяму экіпажу „Седова" гарачае прывітанне. Упэўнены, што з бальшэвіцкай цвёрдасцю совецкіх людзей вы пераможаце ўсе цяжкасці на вашым шляху і верніцеся на радзіму пераможцамі.

Паціскаем вашы рукі, таварышы!

Па даручэнню ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР

І. Сталін В. Молатаў"

Прывітанне кіраўнікоў партыі і ўрада памножылі сілы седоўцаў, улілі ў іх новую энергію.

Выконваючы выключную па значэнню навуковую работу, экіпаж „Седова" жыў адным жыццём з усёй нашай радзімай, з якой яго надзейна звязвала радыё. На дрэйфуючым караблі ішла вучоба, кіпела работа. Многа раз седоўцы, з вялікай небяспекай для жыцця, гераічна адстаівалі давераны ім карабль і навукова абсталя-

(Працяг на 4-й старонцы)

Война в Западной Европе

Париж, 7 января. (ТАСС). В коммюнике, опубликованном вчера вечером, говорится: «В течение дня на различных участках фронта происходили стычки наших патрулей с противником, причем нами захвачено несколько пленных».

Коммюнике, опубликованное сегодня утром, гласит: «на различных участках фронта наблюдалась деятельность патрулей. Вечером в районе восточнее реки Блис происходила довольно оживленная артиллерийская перестрелка».

Берлин, 7 января. (ТАСС). Германское информационное бюро передает следующую сводку верховного командования германской армии:

«На западном фронте — никаких особенных событий. Германская авиация производила разведывательные полеты над Англией и Францией».

Лондон, 7 января. (ТАСС). Агентство Рейтер сообщает, что 5-го января вечером английские самолеты совершили разведывательный полет над северо-западной Германией.

Масавыя расстрэлы і арышты ў бела-Фінляндыі

На тэрыторыі бела-Фінляндыі лютуе нечуваны па сваёй жорсткасці тэрор. Павальныя арышты, масавыя расстрэлы рабочых і сялян, якія выражаюць свае сімпатыі Народнаму Ураду Куусінена і Чырвонай Арміі, сталі звычайнай з'явай. У гарадах і паселішчах, яшчэ занятых белафінамі, бандыцкія шайкі Манергейма робяць вобыскі і аблавы ў пошуках „нядобранадзейных".

Фінскія бежанцы, якія прыбылі ў Нарвегію, расказваюць аб тым, што белафінская ваеншчына кляйміць усіх рэвалюцыйна-настроеных працоўных іменем „шпіёнаў". Белафінскія ўлады яшчэ да вайны загатовілі спіскі рэвалюцыйных рабочых, інтэлігентаў і сялян. Зараз, з набліжэннем часцей Чырвонай Арміі, іх арыштоўваюць.

(ТАСС).

Кто помогает Маннергейму?

СТОКГОЛЬМ, (ТАСС). Несмотря на все усилия организаторов вербовки „добровольцев" на помощь белофиннам, находятся мало охотников помогать маннергеймовской Финляндии. Как сообщает газета „Ню даг", в специальных бюро по вербовке добровольцев записываются главным образом офицеры. Ни один рабочий, разумеется, не записался. Крестьяне также отказываются воевать на стороне белофиннов. И хотя вербовщики усиленно прибегают к испытанным средствам заманивания и принуждения, им удалось завербовать и отправить на помощь Маннергейму лишь небольшой отряд, состоящий из одних белогвардейцев.

Шведские офицеры, торговцы, русские белогвардейцы —вот кто помогает палачу Маннергейму. Главной фигурой среди них является шведский генерал—майор Линдер, „ветеран" белогвардейского похода в Финляндию в 1918 году. После кровавой расправы с рабочими в Тампере, этот ближайший сподвижник Маннергейма получил чин генерал-лейтенанта финской армии. Ныне этот самый Линдер снова направился в белую Финляндию.

НОРВЕЖСКИЕ МЕТАЛЛИСТЫ КЛЕЙМЯТ СКАНДИНАВСКИХ АГЕНТОВ ПОДЖИГАТЕЛЕЙ ВОЙНЫ

СТОКГОЛЬМ, 6 января. (ТАСС). Норвежская газета „Арбейдербладет" опубликовала обращение руководства профсоюза металлистов г. Осло. "Металлисты Осло, — говорится в обращении, — с негодованием клеймят провокационную деятельность, которая ведется в последнее время в Скандинавии агентами поджигателей войны. Рабочий класс Норвегии не даст вовлечь себя в военные авантюры скандинавской буржуазии, пытающейся ввергнуть нас в мировую войну.

Металлисты Осло требуют от правительства принятия решительных мер против агентов поджигателей войны, пытающихся втянуть страну в ненужную бойню".

ВОЕННЫЕ ДЕЙСТВИЯ В КИТАЕ

В ЮЖНОМ КИТАЕ

Согласно сообщениям, китайские войска в северной части провинции Гуандун продолжают наступление на японские позиции. Главные китайские силы, преследуя противника, продвинулись на 30 клм. южнее Индэ по Кантон Ханькоуской железной дороге. Южнее Вэньюаня небольшие китайские отряды с помощью авиации продолжают очищать территорию от японских войск.

На фронте в южной части провинции Гуанси за последние дни китайские части заняли несколько важных пунктов, включая Бумьяо (в 25 клм. восточнее Наньнина) и Учунь (в 27 клм. южнее Наньнина)

ПОЛИТИЧЕСКИЕ РАЗНОГЛАСИЯ В ЯПОНСКОМ ПАРЛАМЕНТЕ

ТОКИО, 7 января (ТАСС). Резолюция недоверия кабинету Абэ, принятая 26 декабря значительной группой депутатов нижней палаты японского парламента, продолжает сейчас оставаться в центре внимания правящих кругов Японии. В настоящее время в оппозиционную группу входит 251 депутат, т. е. более половины депутатов нижней палаты. Газета „Джапан таймс" указывает, что, „несмотря на твердую решимость премьера преодолеть все политические трудности, ему труд но будет осуществить это. В политических кругах считают практически невозможным для премьера провести кабинет через предстоящую сессию парламента, поскольку антиправительственное „настроение среди депутатов парламента продолжает усиливаться".

ЗАБАСТОВКА СЕЛЬСКО-ХОЗЯЙСТВЕННЫХ РАБОЧИХ НА ФИЛИППИНАХ

Нью-йорк, 7 января. (ТАСС) Как сообщает агентство Юнайтэд пресс из Манилы, 20 тысяч сельско-хозяйственных рабочих Филиппин об'явили забастовку. Рабочие требуют увеличения заработной платы и ликвидации полиции при сахарных компаниях.



На здымку: Першая вечэрняя рабочая школа ў г. Беластоку Фото Сапір.

„П Е Т Р I"

В кино-театре „Свобода" демонстрируется известный фильм „Петр I".

Петр Первый занимает исключительное место в галлерее русских самодержцев. Это энтузиаст техники, прогресса, новшеств. Эпоха Петра Первого — это перелом в жизни русского народа.

На постановку этой картины затрачено очень много средств и времени, кропотливого труда большого коллектива людей. Творцы картины не пожалели труда, чтобы найти и живописно изобразить подлинный дух эпохи. В картине много незабываемых образов. Когда по приказу Петра срывают колокол и он, со стоном медя, под вой юродивых и баб, слетает на землю, чувствуется какое великое усилие понадобилось, чтобы столкнуть в вечность прошлое и очистить место для новых живительных течений. Удачное историческое выражение, что Петр I отворил окно в Европу, нашло в картине соответствующее кинематографическое выражение и получилась великолепная незабываемая сцена, поставленная и исполненная с непосредственностью высококачественного искусства.

Игра актеров стоит на самом высоком уровне. В роли Петра актер Симонов воплотил грубую неотесанную непосредственность и кипучую энергию создателя первого русского флота. Рядом с ним в роли Меньшикова замечательный, неподражаемый артист Жаров, хорошо нам знакомый из „Трилогии о Максиме", который выражает свои мысли и чувства самыми мельчайшими, но содержательными мимическими движениями. Мы смотрим с наслаждением на эту исключительно-выразительную игру этих двух актеров. Игра Черкасова в роли Алексея также отличается экономностью мимических движений и еще кроме того единственной в своем роде плавностью движения тела и походки.

Мы ожидаем с интересом 2-ой серии картины, но только жалеем, что многое из диалога пропадает из-за устаревшей звуковой аппаратуры кино-театра.

Д. Кнапайс.

Адказны рэдактар **Б. М. Зельманаў**

(Працяг)

ванне. Калі „Седову" гразіла небяспека, адважныя маракі размяшчаліся ў палатках на крыгах. У пургу, пры 45 градусных марозах, седоўцы паказвалі абразцы мужнасці, вытрымальнасці і адвагі савецкіх патрыётаў. Калі ім была зроблена прапанова змяніцца, яны аднадушна заявілі аб сваім непахісным жаданні прадаўжаць дрэйф да канца.

У чэрвені 1939 г. іх герачнымі намаганнямі быў адрамантаван руль ледакола, папраўлена ўся сістэма ўмацавання. „Седоў" атрымаў здольнасць самастойна следаваць за ледаколам. За праробленую работу Галоўнае Упраўленне Паўночнага Марскога Шляху абвясціла падзяку ўсёй камандзе ледакола.

Радасна адсвяткавалі седоўцы другую гадавіну свайго дрэйфа. З глыбокім хваляваннем прачыталі яны радыёграму за подпісам таварышоў Сталіна і Молатава на імя капітана Бадзігіна і пампаліта Трафімава:

„У другую гадавіну дрэйфа шлем усяму экіпажу „Седова" бальшавіцкае прывітанне. Жадаем вам здароўя, паспяховай перамогі ўсіх нявзгод, звароту на радзіму загартаванымі барацьбой з цяжкасцямі Арктыкі. Паціскаем вашы рукі, таварышы!"

У гэты дзень з гарачым прывітаннем па радыё выступіў Міхаіл Іванавіч Калінін. Мужныя савецкія палярныя маракі атрымалі дзесяткі прывітальных тэлеграм

За два годы дрэйфа ў арктычных ільдах ледакол „Георгій Седоў" прайшоў звыш 2750 міль. Яго экіпажам была прароблена гіганцкая навуковая работа. Зробленыя седоўцамі глыбокаводныя прамеры выявілі ў Ледавітым акіяне глыбіні значна большыя, чым гэта было вядома да гэтага часу. Так, напрыклад, на шыраце 86 градусаў 37 мінут і даўгаце 45 градусаў 05 мінут седоўцамі выяўлена глыбіня ў 4952 метры. Некалькі далей к захаду глыбіня акіяна аказалася больш 5180 метраў. Гэта значна больш, чым максімальная глыбіня, вымераная станцыяй „Паўночны полюс",— 4395 метраў.

Больш чым ў 60 пунктах свайго дрэйфа седоўцы прарабілі назіранні па зямному магнетызму, а таксама назіранні над сілай цяжару. Даследванні правадзіліся з дапамогай навейшых, дакладнейшых прыбораў

Найбольш цэннымі з'яўляюцца метэаралагічныя і гідралагічныя работы экспедыцыі. Ужо зараз, вывучачы папярэднія даныя дрэйфа „Седова", нашы вучоныя ўнеслі рад сур'ёзных папраўак у навуку аб Арктыцы, дапоўнілі яе новымі надзвычайна важнымі абагульненнямі.

Скаваны ільдамі, дрэйфуючы карабль у лістападзе 1939 г. прайшоў мерыдыян Шпіцбергена і рэзка змяніў напрамак на поўдзень, прыбліжаючыся да раёна ціхай вады.

Па прапанове таварыша Сталіна, уважліва сачыўшага за дрэйфам „Седова", урад прыняў рашэнне — направіць насустрач дрэйфуючаму караблю магутны ледакол — флагман арктычнага флота „І. Сталін". 15 снежня ў 10 гадзін раніцы ён вышаў з Мурманска.

Подвіг седоўцаў — гэта новы подвіг савецкага народа, абразец савецкага патрыятызма.

Уся наша краіна з нецярпеннем чакае звароту на радзіму сваіх адважных сыноў (ТАСС).

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара— 45; партаддзела і сакратарыята —47; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў — 17-62; выдавецтва і аддзел аб'яў—35; друкарня і начная рэдакцыя 5[illegible] Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.